# Міністр сустрэўся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны

Ветэраны, родныя, НІЗКІ ВАМ НАШ ПАКЛОН!
За ўсе вашыя подзвігі, за мірнае наша неба.

Сёння, 4 мая, урачыстае ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых работнікаў арганізацый сістэмы Мінсувязі прайшло ў Інфармацыйна-гістарычным цэнтры сувязі (пр-т Пераможцаў, 123). Неабходна адзначыць, што напярэдадні 73- гадавіны Вялікай Перамогі аналагічныя сустрэчы праходзяць ва ўсіх арганізацыях сувязі, як на абласным узроўні, так і на раённым.

На сустрэчы прысутнічалі: Міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей Папкоў, Старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сувязі Ніна Гаўрылава, генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Сяргей Сівадзедаў, намеснік Генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» Таццяна Даньшына, старшыні пярвічных прафсаюзных арганізацый РУП «Белтэлекам», РУП «Белпошта», РУП «БелДІЭ», ААТ«Прамсувязь».

Ганаровымі гасцямі дадзенай сустрэчы былі Грыцук Іван Міхайлавіч, экс-міністр сувязі (са студзеня 1980 па верасень 1994 году - Міністр сувязі і інфарматыкі). Узнагароджаны медалём «За доблесную працу», ордэнам працоўнага Чырвонага сцяга, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Леніна, значком «Ганаровы радыст», прысвоена званне «Заслужаны сувязіст БССР», «Майстар сувязі». З 1980 па 1990 гады абіраўся народным дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і Раманаўская Рэгіна Сцяпанаўна, якая з 1984 па 2000 гады з'яўлялася Старшынёй Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сувязі. Прысвоена званне Майстар сувязі СССР, ўзнагароджана медалём "Ветэран працы», 8 юбілейнымі медалямі, юбілейным медалём «100 гадоу прафсаюзнаму Руху Беларусі" і інш.).

**Ганаровыя ветэраны:**
**Крымава Тамара Андрэеўна**, 21.08.1923 нарадзілася, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджана Ордэнамі Айчыннай вайны ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.» І інш.). У перыяд з 1942 па 1943- тэлеграфіст на лініі фронту. З 1957 па 1990 - аператар, намеснік начальніка міжнароднага ўчастка Мінскага паштамта.
**Русак Зоя Уладзіміраўна**, нарадзілася 10.04.1928, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджана медалямі "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «За ўзяцце Кенігсберга". У перыяд з 1980 года па 1992 - паштальён 107- га аддзялення сувязі г.Мінска.
**Шышоў Васіль Пятровіч**, нарадзіўся 16.04.1927, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны Медалём "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», Медалём «За баявыя заслугі». У перыяд з 1974 па 1987 гады працаваў інжынерам па падрыхтоўцы кадраў заводу «Прамсувязь».

**Лапух Віктар Антонавіч**, нарадзіўся 22.03.1929, малалетні вязень. У перыяд з 1946 па 1953: - тэлеграфіст Баранавіцкага тэлеграфа; 1954-1997 - тэлеграфіст апаратнага цэха Мінскага тэлеграфа

**Баветова Кацярына Іванаўна** , нарадзілася 27.03.1945, малалетні вязень. У перыяд з 1963 па 2003 гады працавала старшым інспектарам электрасувязі. У гады Вялікай Айчыннай вайны 303 Воіна-сувязіста ўдастоены звання героя савецкага Саюза, 12 з іх Беларусы. На сённяшні дзень ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых работнікаў галіны, 102 чалавека (яшчэ 209 - прыраўнаваных да ветэранаў).

Удзельнікі сустэчы пажадалі нашым ветэранам даўгалецця, моцнага здароўя, мірнага неба над галавой і каб з імі былі клопат і любоў блізкіх і родныя людзі.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/04-05-2018-3031*